УДК 338.1

У. А. Кулажанка, д-р экан. навук;
В. В. Емяльянцава, асістэнт УА «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт імя П. А. Сухога»

# НОВЫЯ ЎМОВЫ ВЫТВОРЧАСЦІ І НЕАБХОДНАСЦЬ УДАСКАНАЛЕННЯ ФАКТАРАЎ ЭКАНАМІЧНАГА РОСТУ

The article is devoted to revealing of the external and the internal factors of economic growth in Belarus. Influence of increase of the prices on power resources on profitableness of the enterprises is considered. Character of modern lines of investment and innovational process is shown. Actual measures on assistance to increase in innovations in manufacture are specified. Problems of a choice of an adequate base parameter of gross national product on the basis of which it is possible to judge the current economic growth are opened. Problems of development of individual business and the basic handicaes on its way are mentioned. The big attention is given to problems of increase of efficiency of an agriculture, and also improvement of tax system and structure of foreign trade. Reccomendations on improvement of conditionsof economic development of branches and a national economy as a whole at the present stage are given.

**Уводзіны.** Апошнім часам рэзка пагоршыліся як знешнія, так і, у адпаведнасці з гэтым, унутраныя ўмовы вытворчых працэсаў у горадзе і вёсцы. Прычына – павышэнне цэнаў на паліва і энергію, а праз гэта – ўздзеянне на фарміраванне прыбытковасці грамадскай вытворчасці. Адсюль – узнікненне цяжкапераадольных бар'ераў на шляху стварэння фонду накаплення, а значыць, выдзялення сродкаў на інвестыцыі і інавацыі. Рэзкае павышэнне цэнаў з боку расійскіх пастаўшчыкоў газу і нафты на гэтым не будзе спынена. Цэны на газ і паліва будуць павышацца і ў бліжэйшыя 3–4 гады, што зафіксавана ў падпісаных дамовах паміж Беларуссю і Расіяй. Дадзеная акалічнасць толькі ўскладняе пераадоленне цяжкасцей, што ёсць плата за непрадбачлівую манапалізацыю крыніцаў энергазабеспячэння.

**Асноўная частка.** Аднак ускладненне ўмоваў вытворчасці мае не толькі адмоўны, але і станоўчы бок. Сутнасць яго ў тым, што ўся адміністрацыйная сістэма краіны, прадпрыемствы, вытворцы і прадпрымальніцкі сектар сталі сур'ёзна шукаць рэзервы эканоміі энергарэсурсаў, сыравіны і працы, каб на гэтым шляху знайсці выйсце з цяжкага становішча і адшукаць новыя фактары эканамічнага росту. У краіне створана спецыяльная камісія па распацоўцы мераў эканоміі рэсурсаў. Працы ёй хопіць. Толькі чаму пра гэта не падумалі раней? Выходзіць, што «Пакуль гром не загрыміць, мужык не перахрысціцца?». Але, як кажуць, лепей позна, чым ніколі. Неабходнасць паўсюль перайсці да эканоміі падкрэслівае і Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. Выступаючы ў сярэдзіне студзеня на заводзе бытавой тэхнікі ЗАТ «Атлант», ён не выпадкова заявіў: «Эканомія – найважнейшая ўмова ўмацавання эканамічнай бяспекі і незалежнасці Беларусі». І гэта сапраўды так.

Побач з фактарам эканоміі найперш энергарэсурсаў востра стаіць і праблема выкарыстання мясцовых рэсурсаў, асабліва ўзнаўляемай энергіі ветру, вады, сонца. Дзе тыя ветракі, якія стаялі ў кожнай вёсцы, дзе млыны на малых рэках, якіх было проста безліч? Вельмі важна ўзнавіць іх, і на іх аснове запусціць малыя электрастанцыі. Зараз пра гэта ідуць сур'ёзныя размовы, і змены ў эканоміцы зробяць іх пабудову і ўзвядзенне надзённай патрэбай. А там, дзе ёсць патрэба, будзе і прапанова.

Прыйшоў час пачаць распрацоўкі залежаў бурага вугалю. Якія б ні былі вялікія выдаткі на арганізацыю здабычы, але яны будуць больш прымальныя, чым будучыя выдаткі на куплю газу – 230 долараў за 1000 $м^3$. І яшчэ: у сувязі з падаражэннем газу трэба асцярожна праводзіць газіфікацыю вёскі, бо можа аказацца так, што ацяпляцца зручней і танней дровамі, чым газам. І ці не давядзецца яшчэ, калі не будуць рэальна расці заробкі, класці печкі сялянам, якія ўжо перайшлі на газ? І наогул, выкарыстанне дроў на паліва павінна стаць трывалай крыніцай эканоміі, тым болей што лес усё ж спрадвечна ўзнаўляемы рэсурс. Драўніна, якая нарыхтоўваецца пры доглядзе лесу, а таксама на высякаемых дзялянках, дрэвы, спецыяльна вырошчваемыя на паліва, – магутны і незаменны паліўны рэсурс нашай краіны.

Эканомія рэсурсаў павінна насіць перманентны характар. Праўда, сёння яна выступіла на пярэдні план з-за змены ўмоваў на рынку рэсурсаў. Што датычыцца вызначальнага чынніка развіцця вытворчасці, то ім быў і застаецца інвестыцыйны працэс на інавацыйнай аснове. Прычым інавацыі з'яўляюцца якраз тым новым момантам інвестыцый, якія вызначаюць паскарэнне эканамічнага развіцця і дасягненне наспелых якасных паказчыкаў грамадскай вытворчасці.

Трэба зазначыць, што за апошнія гады ажыццявіўся прыкметны рост інвестыцый. У гэтым росце ўстанавілася станоўчая тэндэнцыя. У 2001 годзе на інвестыцыі было накіравана сродкаў у аб'ёме 17% ад ВУП, у 2002 годзе – 17,2%, у 2003 – 19,5%, у 2004 – 21,6%, а ў 2005 годзе – 23,3%. Улічваючы тое, што рост ВУП склаў у апошнія гады дзесьці 9–10% у год, нібы нядрэнна. Тым болей, што су-светная практыка вызначыла: калі на на-капленне накіроўваецца меней за 20% ВУП, то паскоранае развіццё эканомікі немагчымае. А для Беларусі мала і 23% ад ВУП, бо знос асноўнага капіталу дасягнуў 80% і больш. Таму патрабуецца паскораная замена і ўзмоцненая мадэрнізацыя ўсіх відаў абсталявання. Але тут мы не маем поспехаў, бо, паводле статыстычных дадзеных, у 2005 годзе сярод інвестыцый у асноўны капітал удзельная вага апошняга склала толькі 47,0%. І гэта ў той час, калі 80–85% выкарыстоўваемых тэхналогій з'яўляюцца састарэлымі. Гэта не выпадкова, бо ў беларускай прамысловасці працэнт абнаўлення да пачатку пераходнага перыяду склаў толькі 6–8%, затым, на працягу 90-х гадоў, ён рэзка знізіўся да 1,5%, а ў дадзены перыяд знаходзіцца ў межах толькі 2,4%. Гэта азначае, што калі раней поўнае абнаўленне фондаў можна было ажыццявіць за 12–16 гадоў, то зараз – за 42–50 гадоў.

Адсюль вынікае, што сёння інавацыйны характар інвестыцый набывае першачарговае значэнне. Але гэтаму перашкаджаюць некаторыя чыннікі. Па-першае, сёння краіна не мае больш-менш поўнай інавацыйнай вытворчасці, што можна часова кампенсаваць праз знешні гандаль. Па-другое, нездавальняюча фінансуецца навука. Калі ў 1997 годзе на навуку выдзялялася 2,3% выдатковай часткі бюджэту (або 0,48% ад ВУП), то ў 2005 годзе толькі 1,1% бюджэтных сродкаў (або 0,39% ад ВУП). Між тым, паводле патрабаванняў нацыянальнай бяспекі, на навуку трэба скіроўваць 2% ад ВУП. Якія ў нас адносіны да навукі, не на словах, а на справе сведчыць тое, што, напрыклад, у 2005 годзе ўдзельная вага інвестыцый у навуку склала толькі 0,2%. Па-трэцяе, трэба тэрмінова пераадолець нізкую матэрыяльную зацікаўленасць навуковых супрацоўнікаў, нельга і надалей ігнараваць ролю чалавечага капіталу. Па-чацвёртае, неабходна поўнасцю выкарыстаць магчымыя зберажэнні хатніх гаспадарак для інвестыцый, зняць перашкоды для прыліву замежнага капіталу, зацікавіць яго ў нашых інвестыцыях. Па-пятае, трэба павысіць ролю дзяржаўнага бюджэту ў фінансаванні інавацыйнага працэсу. Гэтая роля на сёння пакуль-што не адпавядае патрабаванням часу.

Узрастаючая роля інавацыйнага працэсу добра ілюструецца канкрэтнымі прыкладамі. Так, калі ўзяць прамысловы комплекс Гомельскага рэгіёну, то там такія мадэрнізаваныя на сучасным тэхнічным узроўні прадпрыемствы, як Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, Гомсельмаш, Жлобінскі БМЗ і іншыя, уяўляюць сабой вытворчасці па сучасных тэхналогіях. Таму іх уклад у аб'ём прамысловай вытворчасці рэгіёну і нават рэспублікі проста вызначальны. Так, на Жлобінскім БМЗ летась (2006 год) аб'ём атрыманага прадукту дасягнуў 1 млрд. долараў, гэта складае аж 3% ВУП краіны, пра што нядаўна заявіў у адной са сваіх прамоваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

Разгледзеўшы асноўны фактар эканамічнага росту і перш чым прыступіць да разгляду іншых фактараў, звернем увагу на тое, што браць за базавы паказчык эканамічнага росту, з паказчыкаў якога года падлічваць рост, бо вызначэнне росту ў параўнанні з папярэднім годам не адлюстроўвае рэальнае становішча. Так, у 1995 годзе вытворчасць ВУП склала 89,6% да паказчыка папярэдняга 1994 года. Але паказчык 1994 года быў паніжаючым ў параўнанні з 1993 годам. Так што рост у 2000 годзе на 5,8% не забяспечваў узроўню нават 1994 года. Трэба, нарэшце, устанавіць год, напрыклад, 2000, на аснове якога весці падлік эканамічнага росту, як рабілася гэта ў Савецкім Саюзе: спачатку да ўзроўню 1913 года, а затым – 1929 года, калі было завершана аднаўленне народнай гаспадаркі пасля сусветнай і грамадзянскай войнаў. Без устанаўлення базавага года цяжка будзе і надалей вызначаць і ацэньваць тэмпы развіцця. Факт застаецца фактам, але сёння невядома, аднавілі мы ўзровень 1990 года ці не. Адны эканамісты, ацэньваючы аб'ёмы вытворчасці па пакупніцкай здольнасці рубля, лічаць, што ўзровень 1990 года мы ўжо дасягнулі і пайшлі далей, другія, вызначаючы аб'ём вытворчасці ў доларах, адмаўляюць гэта. І сапраўды, паводле афіцыйнай статыстыкі, аб'ём вытворчасці ВУП у 1990 годзе ў Беларусі склаў 58 540 млн. долараў, а ў разліку на душу насельніцтва – 5 700 долараў [1]. Па дадзеных афіцыйнай статыстыкі, у 2005 годзе атрымана ВУП 29,5 млрд. долараў [2]. Дык хіба мы дасягнулі ўзроўню 1990 года, тым болей што гэта без уліку дэвальвацыі долара? Праўда, аб'ём вытворчасці ВУП у краіне зараз (на працягу

апошніх 5 гадоў) хутка расце. Па нашых разліках, у 2006 годзе ён дасягнуў болей як 33 млрд. долараў. І наш агульны клопат – каб ён прадаўжаў расці.

Усім зараз зразумела, што аб'яўлены эканамічны рост цяжка будзе забяспечыць без паскоранага развіцця прадпрымальніцкай дзейнасці, без таго, каб індывідуальныя прадпрымальнікі, малы і сярэдні бізнес адчулі падтрымку з боку дзяржавы і грамадства. Развітыя краіны свету дасягнулі высокага ўзроўню развіцця і паспяхова падтрымліваюць яго менавіта за кошт усямернай падтрымкі прадпрымальніцтва. Каля паловы ВУП у ЗША вырабляюць прадпрыемствы дробнага і сярэдняга бізнесу. А гэты ВУП не малы – 13 трлн. долараў, ці 40% усяго прадукту свету. У малым і сярэднім бізнесе ЗША занята амаль палова працоўных рэсурсаў краіны. Толькі ў снежні мінулага года ў краіне дабавілася 167 тыс. працоўных месцаў менавіта за кошт развіцця малога бізнесу, а са жніўня 2003 года па канец 2006 года – каля 7 млн. новых працоўных месцаў.

А як ідуць справы ў нас? На вялікі жаль, доўгі час прадпрымальніцкі сектар не карыстаўся належнай і неабходнай падтрымкай. У выніку за апошнія 4 гады колькасць малых прадпрыемстваў павялічылася толькі на 4 тыс. і дасягнула ўсяго 33 тыс. адзінак. А што датычыцца індывідуальных прадпрымальнікаў, то іх колькасць нават скарацілася: з 189 557 (2002 год) да 177 900 (2005 год). Ці можна здзіўляцца, што доля малых прадпрыемстваў у вытворчасці ВУП у 2005 годзе склала толькі 8,1%? Прырост за 4 гады склаў толькі 0,9%. Як бачым, прадпрымальніцкі сектар трымае нязначнае месца ў вытворчым працэсе краіны. Было б дастаткова, каб яго ўдзельная вага знаходзілася ў межах 30%. Адсюль вынікае, што для паскарэння тэмпаў эканамічнага развіцця краіны і дасягнення яе стабільнага становішча неабходна карэнным чынам змяніць адносіны да дробнага бізнесу з боку дзяржавы, падтрымліваць яго ў такой жа меры, як і дзяржаўны сектар. Інакш не справіцца з пераадоленнем рэальнага беспрацоўя, якое дасягае сёння 7,5% і з'яўляецца значным, асабліва ў гарадскіх пасёлках і малых гарадах.

За апошнія 2 гады дзяржава змяніла свае падыходы да прадпрымальніцкай дзейнасці, бо ніякае паскоранае эканамічнае развіццё немагчымае без уключэння ў актыўную гаспадарчую дзейнасць на самастойнай аснове дзесяткаў тысяч маладых спецыялістаў і рабочых. Наспелі ўмовы для пераадолення тых перашкодаў і супярэчнасцей, якія стаяць на шляху развіцця прадпрымальніцкага сектара.

Як высветлілася, адміністрацыйныя працэдуры – сёння асноўная перашкода развіцця бізнесу. Найперш справе шкодзіць існуючы механізм праходжання адміністрацыйных працэдур, неадпаведнымі з'яўляюцца адносіны чыноўнікаў да бізнесу, праца мясцовых органаў улады па стварэнні ўмоваў гаспадарчай дзейнасці, заканадаўства Рэспублікі Беларусь, якое рэгулюе дзейнасць суб'ектаў гаспадарання. Трэба ліквідаваць вялікія цяжкасці на шляху будаўніцтва і стварэння гаспадарчых памяшканняў. Як можа распачынаць і пашыраць сваю справу прадпрымальнік, калі цэны на зямлю з канца мінулага года ўзляцелі да нябёсаў? Мяркуючы па апублікаваных дадзеных, рашэннямі ўладаў цана аднаго квадратнага метра зямлі пад вытворча-складскую забудову павысілася ў 5,17 разу і дасягнула 68,2 долара. Няцяжка ўявіць, як паўплывае гэта на развіццё бізнесу. Такая ж перашкода стаіць перад прадпрымальнікамі пры арэндзе памяшканняў.

Нямала трэба зрабіць і ў сферы прыцягнення прадпрымальнікамі дадатковых фінансавых рэсурсаў праз крэдыт і лізінг. Праўда, першыя крокі ў гэтым кірунку зроблены. Але гэта толькі пачатак.

Паскарэнне эканамічнага росту, вырашэнне сацыяльна-эканамічных праблемаў немагчымае без дасягнення стабілізацыі сельскай гаспадаркі, яе перабудовы на рыначныя рэйкі і павышэння эфектыўнасці. Належыць канстатаваць, што ўзровень сельскагаспадарчай вытворчасці яшчэ не дасягнуў паказчыкаў 1990 года. Ні па колькасці жывёлы, ні яе прадукцыйнасці, ураджайнасці і валавым зборы збожжа і іншых культур мы не дасягнулі ўзроўню 1990 года. Тэхнічнае забеспячэнне сельскай гаспадаркі, падтрыманне яе асобных арганізацыйных формаў не даюць падстаў лічыць, што вырашэнне аграрных праблемаў, дасягненне надзейнай харчовай бяспекі лёгка і хутка будуць дасягнуты. У гэтым пераконваюць наступныя дадзеныя. Так, пагалоўе буйной рагатай жывёлы рэспублікі ў 1990 годзе складала 6 975 тыс. галоў, у 2005 годзе – 3 980 тыс., кароў адпаведна 2 362 тыс. галоў і 1 565 тыс., свіней – 5 051 тыс. галоў і 3 545 тыс.; у 8 разоў меней авечак і на 22 млн. галоў – птушак. Адпаведна за аналізуемы перыяд скарацілася і вытворчасць: мяса ў забойнай вазе – на 39%, малака – на 24%, яек – на 10%. У раслінаводстве таксама няма значных поспехаў. Валавы збор збожжа ў 2005 годзе быў на 0,6 млн. тон меншы, чым у 1990 годзе, а ў 2006 годзе яшчэ меншы. Бульбы сабрана меней на 400 тыс. тон і г. д. Праўда, прадукцыі раслінаводства ў разліку на душу насельніцтва краіны атрымана толькі нязначна меней, чаго нельга сказаць пра вытворчасць прадуктаў жывёлагадоўлі. У разліку на душу насельніцтва іх атрымана значна менш. Так, вытворчасць мяса ва ўбойнай вазе на душу насельніцтва знізілася з 116 кг у 1990 годзе да 71 кг у 2005 годзе, малака адпаведна з 732 кг да 581 кг.

Крызісны стан сельскай гаспадаркі – з'ява не выпадковая, бо пры рэзкім скарачэнні рабочай сілы ў сельскай гаспадарцы, калі колькасць занятых у гэтай галіне скарацілася з 985,4 тыс. чалавек у 1990 годзе да 462,9 тыс. чалавек у 2005 годзе (болей чым удвая), тэхнічны ўзровень галіны застаецца вельмі нізкім. Так, трактароў за аналізуемы перыяд паменела з 113,4 тыс. да 53,6 тыс. адзінак, зернеўборачных камбайнаў з 30,3 тыс. да 12,8 тыс. адзінак, бульбаўборачных было 8,7 тыс., а стала 1,6 тыс. адзінак.

З гэтай сітуацыі выйсце бачыцца ў правядзенні глыбокай рэформы, якая была праведзена ў суседняй Польшчы, у Германіі ды іншых краінах Еўропы. Перш за ўсё трэба стварыць усе ўмовы для развіцця фермерскіх гаспадарак, павелічэння іх колькасці. Недапушчальна, што ў параўнанні з 1995 годам іх колькасць у 2005 годзе скарацілася з 3 229 да 2 204, або аж на 825 адзінак. А іх доля ў вытворчасці асноўных відаў прадукцыі хоць і ўзрасла з 1% у 1995 годзе да 2,2% у 2005 годзе, што само па сабе знамянальна, але застаецца мізэрнай.

Неабходнасць далейшага рэфармавання сельскай гаспадаркі ў кірунку фермерызацыі звязана з палітыкай і сёння ўжо – практыкай стварэння аграгарадкоў. Можна толькі адобрыць гэтую палітыку, тым болей што яна супадае з нацыянальнай неабходнасцю пакінуць і арганізацыйна не перабудоўваць тыя гаспадаркі, якія прыстасаваліся да рынку, з'яўляюцца рэнтабельнымі і стварылі многа рабочых месцаў. Але калі ў аграгарадках не створыць дастатковую колькасць рабочых месцаў з прыстойнай аплатай працы, то людзі пабягуць і адтуль. Пры стварэнні аграгарадкоў апынуцца ў занядбанні сяляне навакольных вёсак, дзе закрыюцца і ўжо закрываюцца школы, няма культурна-асветніцкіх устаноў і недаступнае медыцынскае абслугоўванне. Захаваць там сялян можна, толькі стварыўшы фермерскія гаспадаркі пры актыўнай падтрымцы дзяржавы, пабудаваўшы туды дарогі, каб можна было даста́ўляць дзяцей у школу, а жыхароў – да месцаў медабслугоўвання. Інакш ёсць небяспека, што будаўніцтва аграгарадкоў, прыцягваючы туды сялян навакольных вёсак, можа прыняць форму згону сялян з зямлі. Гэта на сёння непажадана, бо працэс міграцыі з вёскі зменшыў колькасць занятых у сельскагаспадарчай вытворчасці з 19,1% у 1990 годзе да 10,5% у 2005 годзе. Патрэбы развіцця вытворчасці на вёсцы патрабуюць запавольвання, а можа, і спынення міграцыі рабочай сілы з вёскі. Гэтаму павінна садзейнічаць і павышэнне аплаты працы ў калгасах і саўгасах. Недаравальна, што сярэдняя аплата працы сялянаў складала ў 2005 годзе 286,3 тыс. рублёў, што ўдвая ніжэй, чым у прамысловасці. Зразумела, што пры такой нізкай заработнай плаце сялян не затрымаць і ў аграгарадках.

На сёння вызначальным фактарам эканамічнага росту з'яўляецца ўпарадкаванне падаткаабкладання. Навукай і практыкай засведчана, што эфектыўнасць падатковай сістэмы вызначаецца яе здольнасцю ствараць умовы для ўстойлівага і доўгатэрміновага развіцця. Гэта азначае, што падаткі, якія плацяць вытворцы і грамадзяне, павінны выконваць не толькі фіскальную, але і стымулюючую функцыю. Для нашых умоваў важнейшай функцыяй павінна стаць стымулюючая. Але гэтага пакуль-што няма.

Калі ўзяць падатковую нагрузку ў адносінах да ВУП, то яна дасягнула ў нас аж 40%. Стаўкі падаткаў для нашых прадпрыемстваў на 9% вышэйшыя, чым для расійскіх. Дадзеная акалічнасць не можа не зніжаць канкурэнтаздольнасць беларускіх тавараў на расійскіх рынках.

Заганай падатковай сістэмы Беларусі з'яўляецца тое, што галоўная падатковая нагрузка кладзецца ў нас не на прыбыткі і даходы прадпрыемстваў, бо многія з іх прыбытку не маюць, а ў форме падатку на дабаўленую вартасць – фактычна на насельніцтва. Так, у структуры даходаў бюджэту ў апошнія гады паступленне ад падатку на дабаўленую вартасць дасягае трэці, а падаткі на прыбытак і даходы крыху болей за 15%. Затое падатак на працуючых – у межах 12%.

Са сказанага вынікае, што існуючая ў Беларусі падатковая сістэма з'яўляецца залішне жорсткай, бо практыка паказала, што калі падаткі перавышаюць 30% ад ВУП, то яны не скіраваны на эканамічны рост. Наспелае рэфармаванне падатковай сістэмы трэба ажыццявіць неадкладна.

Але на гэтым шляху ўзнікае вялікая цяжкасць у сувязі з тым, што сёлета рэзка скарачаюцца паступленні ў бюджэт ад знешняга гандлю, якія дагэтуль былі значнымі – каля 9%. Дзе ж выйсце са становішча, калі зніжэнне ставак падаткаў не церпіць адкладу? Нікуды нельга дзецца, трэба карэнным чынам перагледзець выдатковую частку бюджэту: скараціць выдаткі на ўтрыманне адміністрацыі, праваахоўных органаў і г. д. Давядзецца адмовіцца ад будаўніцтва трохпавярховых гмахаў пад зямлёй, іншых збудаванняў, без якіх можна абысціся, а пачаць іх узвядзенне пазней, калі эканоміка ў сваім развіцці дасягне высокага ўзроўню. Зараз усе рэсурсы павінны скіроўвацца на развіццё.

І яшчэ адзін фактар паскарэння эканамічнага развіцця – знешні гандаль. Справа ў тым, што структура гаспадарчай сістэмы краіны такая, што мы мусім завозіць шмат рэсурсаў, асабліва паліва і камплектуючых. З гэтай нагоды без нарошчвання экспарту сваёй прадукцыі мы не ў стане мець неабходны

нам імпарт. Вось чаму знешнеэканамічная палітыка Беларусі скіравана на нарошчванне экспарту, які дасягнуў у 2005 годзе 15 977 млн. долараў, а ў 2006 годзе – звыш 17 млрд. долараў. Характэрна, што аб'ём экспарту перавысіў 52% ВУП.

Заслугай урада з'яўляецца тое, што ён дамогся дыверсіфікацыі як экспарту, так і імпарту. Калі знешнегандлёвы абарот з краінамі СНД, найперш, канешне, з Расіяй, складаў раней 65,5%, то ўжо у 2005 годзе – 55,6%. Адпаведна экспарт у краіны не СНД павялічыўся з 34,5% да 44,4%. Аналагічная змена, праўда менш значная, адбылася і ў сферы імпарту. Калі доля краінаў СНД у імпарце тавараў у Беларусь скарацілася з 70,2% да 66,6% за той жа перыяд, то доля краінаў не СНД узрасла з 29,8% да 33,4%.

Як бачым, за апошнія гады адбыліся станоўчыя змены ў знешнім гандлі. Але гандлёвы баланс у нашай краіне застаецца пасіўным. Так, у 2004 годзе Беларусь завезла тавараў на 2 717,1 млн. долараў больш, чым экспартавала, у 2005 годзе – адпаведна на 721,5 млн. долараў больш, што было значным поспехам, а летась зноў на 2 млрд. долараў болей увезлі, чым вывезлі. Сёлета сітуацыя можа быць яшчэ больш небяспечнай, бо можа скараціцца экспарт. Як-ніяк, а каля 40% нашага экспарту складалі нафтапрадукты. Зразумела, што ў сувязі з гандлёвай вайной з Расіяй такі экспарт можа скараціцца. Значыць, трэба павысіць долю экспарту беларускіх традыцыйных тавараў. А для гэтага неабходна павысіць іх якасць і канкурэнтаздольнасць. Трэба таксама паглыбіць дыверсіфікацыю экспарту. Тым болей што Расія пагражае ўвесці пошліны на прадукцыю сельскай гаспадаркі ды іншыя тавары. Наша краіна губляе ўсялякія прэферэнцыі на Усходзе, што, праўда, у нейкай ступені звязана з уступленнем Расіі ў Сусветную Гандлёвую Арганізацыю. Каб палепшыць гандлёвы баланс, трэба актыўна імкнуцца да імпартазамяшчэння.

Напрыклад, цяжка зразумець і апраўдаць тое, што ў 2004 годзе мы экспартавалі харчовых тавараў на 1 164,2 млн. долараў, а ўвезлі на 1 745,5 млн. долараў, у 2005 годзе – адпаведна на 1 329,5 і 1 787,4 млн. долараў. І такіх прыкладаў шмат.

Выснова можа быць адна – без нарошчвання экспарту і скарачэння імпарту, без павышэння канкурэнтаздольнасці беларускіх тавараў, без дыверсіфікацыі знешняга гандлю немагчыма забяспечыць вызначаныя тэмпы росту эканомікі краіны.

**Заключэнне.** Аналіз паказвае, што ўмовы эканамічнага росту апошнім часам ускладніліся. Поспех можа быць забяспечаны толькі пры ўмове, калі інвестыцыйны працэс прыме форму інавацый, калі прадпрымальніцкі сектар атрымае падтрымку дзяржавы і грамадства, калі сельская гаспадарка будзе выведзена з крызісу, калі будзе ўдасканалена падатковая сістэма ў кірунку змяншэння фіскальнага ціску на вытворцаў, а знешні гандаль будзе скіраваны на эфектыўнасць інвестыцыйнага працэсу.

### Літаратура

1. Вопросы экономики: журн. – 1992. – № 46. – С. 130–133.
2. Белорусский экономический журнал. – 2006. – № 3. – С. 146.
3. Киреева, Е. Ф. Налоговая политика в условиях реформирования национальной экономики / Е. Ф. Киреева // Белорусский экономический журнал. – 2006. – № 5. – С. 101.
4. Крюков, Л. М. Переход к инновационной экономике / Л. М. Крюков // Белорусский экономический журнал. – 2006. – № 4. – С. 12–24.
5. Никитенко, П. Г. Модель устойчивого социально-экономического развития Беларуси: проблемы формирования и эволюции / П. Г. Никитенко. – Минск: Право и экономика, 2000. – С. 44
6. Основные направления социально-экономического развития Республики Беларусь на 2001–2005 годы. – Минск, 2001. – С. 26–32.
7. Статистический ежегодник Республики Беларусь. – Минск, 2006. – С. 65–73.